ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК
”Шаркаўшчынская ЦБС“
Т.М. Райчонак

# ПАЛАЖЭННЕ
аб конкурсе на лепшы сцэнарны матэрыял патрыятычнай тэматыкі
**”ПАМЯЦЬ БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ“,**
заснаваны на краязнаўчым матэрыяле

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
1.1. Раённы конкурс на лепшы сцэнарны матэрыял патрыятычнай тэматыкі ”Памяць без тэрміну даўнасці“, заснаваны на краязнаўчым матэрыяле, праводзіцца ў рамках святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі і Шаркаўшчынскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
1.2. Арганізатарам раённага конкурсу з’яўляецца сектар бібліятэчнага маркетынгу ДУК ”Шаркаўшчынская ЦБС“ пры фінінсавай падтрымцы пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ДУК ”Шаркаўшчынская ЦБС“.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ
2.1. Выхаванне грамадзянскай пазіцыі ў моладзі і падрастаючага пакалення патрыятычных каштоўнасцяў, поглядаў і павагі да гістарычнага і культурнага мінулага Рэспублікі Беларусь;
2.2. Павышэнне эфектыўнасці дзейнасці бібліятэк па ваенна-патрыятычнаму выхаванню;
2.3. Пашырэнне і ўмацаванне сацыяльнага партнёрства з грамадскімі арганізацыямі і агульнаадукацыйнымі школамі Шаркаўшчынскага раёна ў справе патрыятычнага выхавання. Асаблівую ўвагу ўдзяліць дзяржаўным святам Дню Перамогі, Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, Дню Незалежнасці, Дню народнага адзінства.

## 3. ТЭРМІНЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ
Конкурс праводзіцца з 1 сакавіка па 1кастрычніка 2024 года.

## 4. УМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ
4.1. У конкурсе ўдзельнічаць сельскія бібліятэкі-філіялы, дзіцячая бібліятэка і аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі;
4.2. Да разгляду аргкамітэтам прымаюцца тлумачальная запіска, сцэнарый і фотаздымкі мерапрыемства патрыятычнай накіраванасці, пададзеныя ў тэрмін на электронны адрас сектара бібліятэчнага маркетынгу cbs@sharkovshchina.vitebsk-region.gov.by

## 5. КРЫТЭРЫІ І ПАТРАБАВАННІ ДА КОНКУРСНЫХ РАБОТ

- адпаведнасць зместу мерапрыемства мэтам і задачам конкурсу;
- інавацыйнасць і арыгінальнасць ідэі;
- творчы падыход да распрацоўкі сцэнарыя;
- навізна і актуальнасць мерапрыемства;
- якасць фотаздымкаў павінна мець высокі мастацкі ўзровень.

## 6. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ КОНКУРСУ

6.1. Для арганізацыі і падвядзення вынікаў конкурсу ствараецца аргкамітэт (журы) у складзе:
старшыні – дырэктара ЦБС Т.М. Райчонак,
членаў: загадчыцы сектара бібліятэчнага маркетынгу А.М. Гарлуковіч,
старшыні прафкама В. А. Мілянцей,
бібліятэкара сектара бібліятэчнага маркетынгу М.Г. Сушко,
мастака-афарміцеля С.В. Заіка.

6.2. Аргкамітэт (журы) аналізуе прадстаўленыя тлумачальныя запіскі, сцэнарыі і фотаздымкі, ацэньвае, вызначае лепшыя, арганізуе ўзнагароджванне пераможцаў.

6.3. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджванне пераможцаў адбудзецца на вытворчай нарадзе ў лістападзе 2024 года.